# ЗАДАННІ ПА ФАРМІРАВАННІ ЧЫТАЦКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

*Троцкая Таццяна Андрэеўна*

***Анатацыя.*** У публікацыі прадстаўлены прыклады заданняў па фарміраванні чытацкай пісьменнасці для вучняў VIII класаў.

У спісе здольнасцей XXI стагоддзя чытацкая пісьменнасць займае першае месца. Па матэрыялах Міжнароднай праграмы па ацэнцы адукацыйных дасягненняў навучэнцаў (PISA), чытацкая пісьменнасць – гэта «здольнасць чалавека разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для таго, каб дасягнуць сваіх мэт, пашырыць свае веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці» [3].

Дадзеная распрацоўка накіравана на фарміраванне ў навучэнцаў навыкаў і ўменняў, якія характарызуюць чытацкую пісьменнасць.

**Заданне. Прачытайце тэкст, выканайце заданні да яго.**

*Калегіум езуітаў у Оршы*

Манахі-езуіты, якія насялялі тэрыторыю Оршы ў 1610 годзе, атрымалі ад караля Жыгімонта III у падарунак будынак. У ім калісьці збіраліся для правядзення сеймаў. Манахі ж утварылі навучальную ўстанову – калегіум езуітаў. У тыя часы атрымаць адукацыю ў ім мог кожны жадаючы незалежна ад свайго матэрыяльнага дастатку.

Імкненне да ведаў заахвочвалася і падмацоўвалася тым, што ствараліся ўсе ўмовы для навучання. Так, на тэрыторыі калегіума была створана першая аптэка ў Оршы і разбіты самы сапраўдны сад з лекавымі раслінамі. Дарэчы, сад быў таксама першым і адзіным у горадзе. Прыцягваў як саміх навучэнцаў, так і жыхароў горада цудоўны тэатр. Вядома, што на тэрыторыі калегіума знаходзіліся бібліятэка, а таксама касцёл у гонар Святога Архангела Міхаіла. Усе вучні маглі наведваць музычную школу, спяваць у хоры. Але асноўная стаўка ў калегіуме езуітаў рабілася на вывучэнне лацінскай мовы. Яе веданне лічыліся прыкметай адукаванасці.

На жаль, перыяд росквіту калегіума ў Оршы быў зусім нядоўгім. У 1820 годзе дзейнасць Ордэна езуітаў была забаронена, і будынак перайшоў пад уладу вайсковага ведамства. Былы калегіум ператварыўся ў турму, якая размясцілася тут на некалькі дзесяцігоддзяў. Аж да 1989 года там знаходзіліся зняволеныя.

Свае правы дыктуе новая эпоха, якая і стала пераломнай для будынка калегіума езуітаў у Оршы. Шмат было зроблена, каб аднавіць першапачатковы выгляд гэтай навучальнай установы. Вядома, усё гэта адбылося дзякуючы навукоўцам, даследчыкам і неабыякавым да гісторыі людзям.

Будынак калегіума быў канчаткова адноўлены ў 2014 годзе. У аснове рэканструкцыі ляжалі звесткі з існуючых дакументаў і археалагічных знаходак. Цяпер тут размяшчаецца мастацкая галерэя, дзіцячая бібліятэка і выставачная зала. Непадалёк, у будынку былой музычнай школы, знаходзіцца Дом рамёстваў.

Разгарніце любы даведнік па Беларусі і паглядзіце на шматлікія фотаздымкі. Вы ўбачыце, што ў Оршы першай славутасцю з'яўляецца адноўлены будынак калегіума. Ён стаў сапраўдным тварам горада, і менавіта па ім цяпер можна пазнаць саму Оршу. Многія турысты выяўляюць шчырую цікавасць да гісторыі яго ўзнікнення і мінулага, якое назаўжды застанецца ў памяці пакаленняў. (Паводле матэрыялаў сайта www.vetliva.by).

**1. Што такое «калегіум»? Выберыце правільны варыянт адказу.**

А. Месца, дзе ў старажытнасці стаяў горад, паселішча.

Б. Вялікі будынак, які вылучаецца сваёй архітэктурай.

В. Навучальная ўстанова ў XVI-XIX стст.

Д. Гаспадарка памешчыка (жылыя і гаспадарчыя будынкі, прадпрыемствы) разам з зямельнымі ўгоддзямі.

**2. Прачытайце сцвярджэнні. Вызначыцеся, згодны са сцвярджэннямі ці не. Выберыце варыянт адказу.**

| | | |
|---|---|---|
| 1. Купцы ўтварылі навучальную ўстанову – калегіум езуітаў. | А. Так | Б. Не |
| 2. Атрымаць адукацыю ў калегіуме ў тыя часы маглі толькі людзі з матэрыяльным дастаткам. | А. Так | Б. Не |
| 3. Асноўная стаўка ў калегіуме езуітаў рабілася на вывучэнне лацінскай мовы. | А. Так | Б. Не |
| 4. Былы калегіум ператварыўся ў школу, якая размясцілася тут на некалькі дзесяцігоддзяў. | А. Так | Б. Не |
| 5. Цяпер у будынку размяшчаецца мастацкая галерэя, дзіцячая бібліятэка і выставачная зала. | А. Так | Б. Не |
| 6. У Оршы першай славутасцю з'яўляецца адноўлены будынак калегіума. | А. Так | Б. Не |

**3. Як вы лічыце, на якім фотаздымку адлюстраваны будынак калегіума. Выберыце правільны варыянт.**


1



2


3

**4. Устанавіце адпаведасць паміж датай і падзеяй.**

| | |
|---|---|
| 1. 1610 | А. Завяршылася рэканструкцыя калегіума. |

| | |
|---|---|
| 2. 1820 | Б. Менавіта па калегіуму цяпер можна пазнаць саму Оршу. |
| 3. 2014 | В. Дзейнасць Ордэна езуітаў была забаронена, і будынак перайшоў пад уладу вайсковага ведамства. |
| 4. Наш час | Г. Манахі-езуіты атрымалі ад караля Жыгімонта III у падарунак будынак. |

**5. Азнаёмцеся са спісам пабудоў і вызначыце тыя, якія знаходзіліся на тэрыторыі калегіума ў XVII стагоддзі.**

1. Аптэка.
2. Друкарня.
3. Бібліятэка.
4. Музычная школа.
5. Выставачная зала.
6. Тэатр.

**6. Для кожнага слова знайдзіце адно вернае тлумачэнне.**

| Слова | Тлумачэнне |
|---|---|
| 1. Езуіт<br><br>2. Касцёл | А. Член рэлігійнай абшчыны, які жыве ў манастыры і вядзе аскетычны спосаб жыцця.<br>Б. Твор мастацтва, намаляваны на сцяне будынка.<br>В. Член манаска-каталіцкага ордэна, заснаванага для барацьбы з рэфармацыяй і абароны папства.<br>Г. Каталіцкі храм.<br>Д. Музей для выставы мастацкіх твораў. |

**7. Аднавіце правільную паслядоўнасць пералічаных пунктаў, каб атрымаўся план да тэксту.**

1. Рэканструкцыя будынка.
2. Новая эпоха.
3. Падарунак ад караля.
4. Першая славутасць у Оршы.
5. Лацінская мова — прыкмета адукаванасці.
6. Цяжкі перыяд.

**8. Якімі электроннымі рэсурсамі вы будзеце карыстацца, калі захочаце больш даведацца пра калегіум у Оршы?**

1. Архітэктура і выяўленчае мастацтва Беларусі ў XIII-XV ст.ст. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belhistory.com/architecture-art-13-15.html
2. Архітэктура і выяўленчае мастацтва Беларусі ў XVI-XVII ст.ст. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belhistory.com/architecture-art-16-17.html
3. Аршанскі езуіцкі калегіум [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://be.advisor.travel/poi/Arshanski-ezuicki-kalegium-23273

**9. Як вы лічыце, чаму многія турысты цікавяцца гісторыяй узнікнення ў Оршы езуіцкага калегіума? Запішыце дзве прычыны.**

________________________________________

________________________________________

## Спіс літаратуры


1. Баханькоў, А.Я. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: для сярэд. школы / А.Я. Баханькоў, І.М. Гайдукевіч, П.П. Шуба. — Мінск : Нар. асвета, 1996. — 415 с.
2. Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў / А.М. Булыка. — Мінск: Нар. асвета, 1993. — 398 с.
3. PISA-2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.adu.by/images/2021/05/Kn2-PISA-2018-chitatel-gramotnost.pdf. — Дата доступа: 15.05.2022.
4. VETLIVA: сервис анлайн-бранiравання і аплаты, а таксама каталог турыстычных паслуг Беларусі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://vetliva.by/belarus/what-to-see/kollegium-iezuitov-v-orshe/ — Дата доступу: 15.05.2022.


*Дата поступления в редакцию: 14.10.2022*

**Адказы:**

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| В | 1 — Б;<br>2 — Б;<br>3 — А;<br>4 — Б;<br>5 — А;<br>6 — А | 3 | 1 — Г;<br>2 — В;<br>3 — А;<br>4 — Б | 1, 3,<br>4, 6 | 1 — В;<br>2 — Г | 3, 5, 6,<br>2, 1, 4 | 2, 3 |